Прачытаў у 71-ым нумары "Народнай волі" артыкул В.Бысава "Энкавэдзісты, або Споведзь былога супрацоўніка НКУС". Прачытаў якраз у той момант, калі мой матэрыял на гэтую ж тэму ляжаў на машынцы. І не здзівіўся, што факты, метады і прыёмы катаванняў і расстрэлаў ні ў чым невінаватых людзей у час сталіншчыны ў нашых артыкулах супалі. Бо былі адны інструкцыі, спушчаныя з Крамля, адна тэхналогія допытаў, катаванняў і расстрэлаў. І выкананне гэтых крывавых загадаў і інструкцый у нашых артыкулах — нібы родныя блізняты. Такіх вельмі лёгка знайсці і сёння.

Цяпер Беларусь перажывае не лепшыя часы. Здаецца, застаўся толькі адзін крок да генацыду сталінскіх часоў.

Дык няхай жа і мой артыкул будзе яшчэ адным напамінкам аб тым страшным, што было пры Сталіне і што можа быць заўтра з намі. Няхай ён будзе працягам тэмы, своечасова ўзнятай В.Бысавым у газеце, бо цяпер ужо трэба крычаць, а не паўтараць словы Фучыка: "Людзі, будзьце пільнымі!"

Аўтар.

"Застрэліш — нібы камара забіў..."

Зараз мне здаецца, што ведаў гэтага чалавека з самога дзяцінства, хоць прыехаў ён у нашу глухую палескую вёску, калі я быў ужо студэнтам. Прыязджаючы на летнія канікулы, заўсёды сустракаў яго ўвечары на вуліцы, на якой падымаў пыл калгасны статак. Ззаду статка, галёкаючы і шлёгаючы пугаю па пяску, ступаў высокі са сплюснутым і гарбаносым, нібы склюд, тварам пастух. Здароўкацца са мною не здароўкаўся, толькі пазіркваў з-пад ілба. Ад яго позіркаў на душы рабілася ніякавата.

І вось што я заўважыў: мае землякі на пастуха не звярталі ніякай увагі, нібы ён і не жыў у нашай вёсцы, не рабіў у калгасе, нібы наогул яго тут не было. "Дзікі чалавек! — адмахваліся рукамі, калі я пачынаў распытваць пра пастуха. — Ніколі не выходзіць на людзі, не заходзіць ні ў клуб, ні ў сельсавет, не запрашаюць яго ні на вяселлі, ні на радзіны. Словам ніколі да чалавека не абзавецца. Гэта Алена Шчарбатая такога дзікуна ў Сібіры знайшла і ў вёску прывалакла. Нейкага недапечанага адтуль выцягнула".

Летась я зноў наведаў родную вёску. Пайшоў ранкам у лес па грыбы. І раптам у густым хвойніку нос у нос сутыкнуўся са старым чалавекам з патрэсканымі акулярамі на носе. На плячы дзеда вісеў кашэль, а ў ім — два старыя аблезлыя баравікі, падобныя на самога грыбніка.

— Мо, знойдзецца закурыць? — спытаў дзед.

Прыгледзеўся — перада мною згорблена стаяў былы калгасны пастух.

Селі на калоду і закурылі. Доўга маўчалі.

— Што чуваць у сталіцы? — першым азваўся ён.

— Дыктатура наступае.

— Пралетарыята?

— Міліцэйскай дубінкі. Вельмі часта яна "гуляе" па спінах людзей, якія выходзяць на вуліцы патрабаваць свабоды, справядлівасці і дэмакратыі. Нават старых лупцуюць. Ганяюцца за людзьмі. Хапаюць у падваротнях, пад'ездах, арыштоўваюць, штрафуюць. Сталінскі хапун вярнуўся. Дэмакратаў, як ворагаў народа, хапаюць.

— Гэта кветачкі. Ягадкі яшчэ будуць, — спакойна прагугнявіў стары. — Я калісь такіх "ворагаў народа" ў падвалах пачкамі расстрэльваў.

— ?!

Ад яго слоў я аж адубянеў. Па спіне пракацілася халодная хваля, і я хацеў было падняцца з калоды, каб пакінуць гэтага страшнага чалавека, але ён сказаў, як загадаў:

— Не спяшайся. Лепш выслухай мяне.

Я трохі супакоіўся і пачуў споведзь ветэрана нашага калгаса і сталінскіх карных органаў.

— Ці паверыш, колькі давялося мне шлёпнуць, а некаторых да гэтага часу памятаю ў твар. Аднаго застрэліш — і нічога, быццам камара забіў. А другі так на цябе зірне, што аж душа выварочваецца. Потым не можаш заснуць, усё ён перад табою стаіць. Нажлунцішся, нап'ешся, каб забыцца, — толькі тады трохі прыкімарыш. А цяпер, у старасці, піць больш не магу. Але і не сплю. А да сну клоніць — трываць не магу. Ляжаш на ложак, заплюшчыш вочы — хто-небудзь з іх абавязкова выплыве з цемені, "наведае". Спахопліваюся, выходжу на двор і даю кругі да раніцы. Пакаранне мне, мабыць, такое — да самой смерці не ведаць спакою.

Вось пытаю ў сябе: ну чаму гэта я апынуўся на такім крывавым месцы? Мог жа быць настаўнікам, інжынерам, машыністам або яшчэ кім-небудзь — багата дарог у жыцці. Лёс мяне выбраў? Відаць, так. Але, калі сумленна казаць, я і сам на яго падзейнічаў. Спрабаваў грахі бацькі перад Савецкай уладай замаліць. Каб мяне за іх не чапалі. Бацька мой быў гандляром, трымаў карчму ў нашай вялікай вёсцы. Рэвалюцыю, савецкую ўладу апошнімі словамі лаяў — я гэта памятаю, хоць і маленькі тады быў.

У нашай мясцовасці дзейнічаў партызанскі атрад белагвардзейцаў. Бацька і падаўся туды. У 1919 годзе атрад быў разбіты. Па прыгавору Рэўтрыбунала бацьку паставілі да сценкі. Наогул у грамадзянскую вайну ў нас, у Сібіры, тварыліся дзікія пагромы, асабліва ў вёсках. Памятаю, у 1924 годзе сяляне ўзбунтаваліся, і ў нашай вёсцы таксама, супраць улад, іх рабаўніцкіх хлебных падаткаў. І зноў Чырвоная Армія і атрады ГПУ са сваім народам ваявалі. А наша сям'я тады вырашыла перасяліцца да радні на Урал. Маці разумела, што для яе сыноў, дзяцей расстралянага "класавага ворага", на старым месцы спакою не будзе, нават жыцця. Спісаліся з родзічамі і пакінулі, як гаворыцца, бацькоўскі дом, кінулі амаль усё, што нажывалі гадамі. Мне было ўжо шаснаццаць — пара ісці на заробкі, каб памагчы мацеры. Прыкінуў я, дзе больш плацяць грошай, — і махнуў на Данбас, на шахту. Скумекаў — новую біяграфію сабе прыдумаў. Маўляў, бацька мой — селянін-бядняк, які загінуў на фронце першай сусветнай вайны. У нас жа палова вёскі насіла аднолькавыя прозвішчы, сярод якіх былі і загінуўшыя на фронце. Сышло. Я і разлічваў, што ніхто маю анкету правяраць не будзе, не такая важная асоба — галадраны хлапчук з другога канца мацерыка.

Ведаеш, мне заўсёды былі агіднымі і смешнымі чыстаплюі з сумленнем, якія гінулі, але не жадалі сваю класавую прыналежнасць хоць трохі падфарбаваць, — бацькам, бачыш ты, "здрадзіць". А бацькі, мабыць, толькі і марылі, каб іх сынок выбіўся ў начальнікі любой цаной...

Хутка мяне, як сацыяльна чыстага, накіравалі на вучобу па камсамольскай пуцёўцы ў чыгуначны тэхнікум. Закончыў яго — райком камсамола адправіў у вёску ўпаўнаважаным на правядзенне калектывізацыі. Я, канешне, моцна стараўся, нікога не шкадаваў, толькі б не западозрылі ва мне "варожага элемента". І мяне адзначылі: як самага актыўнага, які надта вызначыўся пры раскулачванні, абком камсамола накіраваў курсантам у школу НКУС. Я радаваўся: цяпер ужо не мне трэба было баяцца, а мяне ўсе будуць баяцца!

Адвучыўся я ў той школе, атрымаў прызначэнне ў Краснаярскі край. Тут калектывізацыя толькі разварочвалася. Я, як старшы ўпаўнаважаны НКУС, — на пярэднім рубяжы, само сабой.

Памятаю, спусцілі нам план па раёну: выявіць 300 кулацкіх элементаў. Чаму 300, а не 275 або 320? Гэтае пытанне мне тады ў галаву не прыходзіла. Я ўвесь аж калаціўся ад жадання паказаць, на што здольны. Але дзе гэтых 300 "кулакоў" набраць? Вось што мяне турбавала. Пачаў складаць спісы. Ды па трох катэгорыях, як загадана. Першыя — тыя, хто ў грамадзянскую з белымі нюхаўся або ў каго ў радні былі ўцекачы за мяжу. Ну і яшчэ — багацей, у каго ў гаспадарцы не меней трох кароў і конь. Гэтых усіх трэба было адпраўляць на Салаўкі або на Калыму. Другая катэгорыя — па-першае, брахуны, хто пра Сталіна або Савецкую ўладу лішняе сказаў, а па-другое, у каго не менш дзвюх кароў і конь. Ім — бестэрміновая "пуцёўка" ў тайгу, на лесанарыхтоўкі. І трэцяя катэгорыя — "падкулачнікі". Як іх вызначыць? А так: на каго пакажа сельсавет. Той радня кулаку, той кум або проста сусед, які не данёс... Іх — за межы раёна. Але куды? У суседніх раёнах сваіх "кулацкіх" і непажаданых элементаў поўна, ім чужых не трэба. Вось і даводзілася трэцюю катэгорыю таксама адпраўляць падалей, у тую ж тайгу, дзе яны, падарваўшы здароўе, застануцца назаўсёды — у мёрзлай зямлі.

Усе катэгорыі, паміж іншым, мелі сваю цану, і нядрэнную, так што мы не задарма стараліся. За кожнага высланага і арыштаванага з першай катэгорыі плацілі нам па 15 рублёў, з другой — па 10, з трэцяй — па 5 рублёў. Грошы не цяперашнія — тады карова на кірмашы каштавала 3 рублі. Вось і лічы. Сялян высылалі сотнямі і тысячамі. Плацілі і нашым памочнікам з мясцовага насельніцтва — за даносы. Да 15 працэнтаў канфіскаванай маёмасці мог узяць сабе душагуб — хіба дрэнна?

Значыцца, склаў я спісы, чакаю загад. І аднойчы раніцай атрымліваю тэлефанаграму: "Ізаляваць тры катэгорыі". У мяне ўсё гатова. Збіраю атрад актывістаў з мясцовай беднаты — я з імі ўжо да гэтага правёў неабходную работу — і ідзём трэсці папа, "доўгагрывага", — так мы святароў называлі. Заходзім да яго ў дом — божачка святы! Вісяць усе трое: гаспадар, яго жонка і сын. А на стале запіска: "Будзь ты пракляты, антыхрыст Сталін!" Пакуль мы кожнага з пятлі вылузвалі, здымалі ды на падводу грузілі, у вёсцы ўжо паднялася паніка. Некаторыя жанкі спрабавалі дзяцей схаваць, хто ў склеп, хто ў суседзяў, якім не гразіла раскулачванне. Але ў нас жа ўсюды былі свае людзі, аб усім даносілі. А большасць у вёсцы была нібы паралізавана. Сядзелі і чакалі, калі мы за імі прыйдзем. Чакалі нядоўга: мы спяшаліся да змяркання — зімовага, ранняга — паспець, усіх у райцэнтр адправіць. Выганялі людзей на мароз, а было пад 40 градусаў, каго без верхняй вопраткі, каго босым: яны або не паспявалі апрануцца, або нашыя памочнікі, актывісты мясцовыя, сабе іх валёнкі ды кажухі ўжо забралі.

Пакуль абоз у райцэнтр цягнуўся, некалькі дзетак мацеры па дарозе ў снег з падвод выкінулі — можа, хто падбярэ, а не — няхай адразу замерзне, чым гніць і гінуць у няволі. А калі пачалі падводы разгружаць, знайшлі некалькі маленькіх трупікаў — зноў справа рук мацерак, якія звар'яцелі. Страшна гэта было. За праведзеную аперацыю я не толькі трыста "элементаў" з сем'ямі прывёз, але і перавыканаў план. Тады ўсюды толькі і чуваць было — выканаць і перавыканаць! Хоць план па здабычы вугалю або выплаўцы сталі, хоць па выкапцы бульбы або па арыштах... Ну і ўзнагародзілі мяне граматаю, а што яшчэ лепш — яшчэ адным кубікам у пятлічку (пагонаў з зорачкамі тады яшчэ не было).

Усё гэта зараз успамінаючы, я не раз думаў: ну чаму людзі сябе не абаранялі, чаму ішлі як авечкі на забой? Эх, ім тады б якога-небудзь Пугачова. Вось тады б раскінуўся пажар! Я ж бачыў — селянін зверам на камуністаў глядзеў. Але савецкая ўлада так сумела людзей заблытаць, што самы смелы і адважны "Пугачоў" не змог бы іх узбунтаваць.

Між тым нам, чэкістам, работы з кожным годам прыбаўлялася. Асабліва пасля забойства Кірава. Па ўсёй краіне пайшлі масавыя арышты. Ад даносаў не было адбою. Мяне яшчэ павысілі. Даверылі весці следчую работу, кіраваць брыгадаю, якая выконвала прыгавор — расстрэльвала. Я, як і другія ў нас, лічыў гэта нармальнай работай. Сродкі для выбівання паказанняў прымяняліся розныя. Часта мы ставілі падследчых "на стойку". Чалавек стаяў, пакуль не траціў прытомнасць, і падаў на падлогу. Яго адлівалі халоднаю вадою і зноў — стаяць. У яго ногі так распухалі, што халявы ботаў лопаліся. Боль страшэнны. Але былі такія ўпартыя, што і пасля гэтага маўчалі. Запомніў я аднаго — па прозвішчу Давыдаў. Адмаўляўся падпісваць "прызнанне", хоць кол на галаве чашы. Дацiснуў усё ж я яго... селядцом. Смага не цётка. За шклянку вады багата хто падпісваў сабе смяротны прыгавор. Вось і Давыдаў, ваенны ўрач з Ленінграда. На яго быў данос, што ў японскае консульства ходзіць, ваенныя тайны прадае. Данёс яго калега — таксама ўрач, сусед па кватэры. Камунальнай. Хацеў пакой Давыдава займець, каб два стала. Дык вось, за шклянку вады Давыдаў дзве старонкі патрэбных мне паказанняў падпісаў. А потым яго расстралялі.

Якія толькі праз нашыя рукі людзі не праходзілі! Памятаеш, быў такі знакаміты трубач — Эдзі Рознер, сябра Уцёсава? Дык вось, ён у нас у лагеры тачку катаў... І знакаміты Старасцін лес валіў. На перасылцы, дзе я адзін час служыў, Ракасоўскі, будучы маршал, сядзеў шэсць месяцаў. Там яму следчыя зубы павыбівалі. Потым з пратэзнымі франтамі кіраваў. І памёр не са сваімі зубамі.

Ніколі не забуду яшчэ аднаго ўрача — Нікіціна. Ён у Крамлі правадыроў лячыў. Яго абвінавацілі, быццам ён Куйбышава атруціў. Аднойчы мне далі каманду: "Дацiснуць забойцу Куйбышава". Мне, канешне, было зразумела, што гэта азначае. Выклікаў я Нікіціна на допыт. Пасадзіў яго... на ножку табурэта. Васемнаццаць гадзін так пратрымаў. Упарты быў тып. Наогул адмаўляўся з намі размаўляць. Не разумею і зараз, як ён вытрымаў — ні падняцца не мог, ні паварушыцца — адразу схапіў бы моцны ўдар... Ну, ладна, давялося да яго прымаць іншыя меры. Адправілі яго ў карцэр, дзе ён трое сутак правісеў, падвешаны за ногі. І зноў нічога. Павялі ў "душ", праз кожныя тры хвіліны вылівалі яму на галаву па вядры то гарачай, то халоднай вады. Ён маўчаў. Наладзілі яму "англійскі бокс" — білі без перадышкі трое сутак. Адны стамляліся, іх падмянялі другія. Выбілі зубы, адбілі лёгкія, ён сыходзіў крывёю. Але "паказанні" не падпісваў. Вырашыў, відаць, што лепш памерці, бо жыць усё роўна не мог — пакалечаны, знявечаны. Тады я прыдумаў другі ход. Арыштавалі яго дачку і пасадзілі ў камеру да крымінальніц, а яго, Нікіціна, змясцілі ў адзіночку, якая была па суседству з гэтай камерай. Ён мог чуць, што там, у крымінальніц, робіцца. Дачку Нікіціна пачалі біць, па маёй "парадзе". Плявалі ёй у твар, выдзіралі косы, палілі скуру, палавыя органы... Яна крычала немым крыкам страшна і адчайна: "Татачка, прызнайся, татачка, падпішы!" Гэтага ён не вытрымаў. Загрукацеў кулакамі ў дзверы, папрасіў следчага. І ўсё, што яму падсунулі, падпісаў. Прызнаўся, што з'яўляецца "агентам" англійскай, японскай, кітайскай разведак, назваў "саўдзельнікаў" — толькі б адпусцілі дачку.

Хутка Нікіцін па прыгавору ваеннага трыбунала, старшынёй якога працаваў будучы другі абвінаваўца ад СССР на Нюрнбергскім працэсе, Нікітчанка, быў прыгавораны да расстрэлу. Праз некалькі гадзін прыгавор быў прыведзены ў выкананне — з маім удзелам. Адмучыўся ён.

Зараз я думаю: як мая псіхіка такое вытрымала? Але ў тыя гады я проста служыў і ні пра што больш стараўся не думаць.

А жыццё падкідвала ўсё новыя "сюжэты". Неяк мы арыштоўвалі былога партызана грамадзянскай вайны, інваліда — яму снарадам руку адарвала. І вось цяпер нехта на яго данёс, што ён антысавецкі элемент. Разам з дачкою... А ведаеце, хто быў той стукач? Асабістая жонка інваліда, адпаведна маці дачкі. Яна працавала інструктарам у райкоме партыі. З мужам была на нажах, мела палюбоўніка. А дачка была за бацьку. Вось мамулька і вырашыла ад дваіх пазбавіцца. Напісала, што муж сваімі рукамі ў прысутнасці дачкі спаліў у печы партрэт дарагога таварыша Сталіна! У момант арышту яна ўхітрылася ўсунуць мне ў руку хабар і шапнуць, как мы яе абераглі ад непрыемнасцей у райкоме. Ну хто яе прымушаў так паступаць?! Калі мы бралі яе мужа, ён неяк пакарыўся. Але калі ўбачыў, што забіраем і дачку, да таго раз'ятрыўся, што аднаму з нашых супрацоўнікаў выбіў вока! Ну і заплаціў жыццём. Расстралялі. А што з ім рабіць? Бязрукага на лесапавал не пашлеш. Што, задарма яго карміць? Навошта ён патрэбен на гэтым белым свеце...

Ёсць такая прыказка: Бог даў (жыццё), Бог забраў... Не ведаю, як наконт "даў", але што датычыцца "забраў", дык не Бог, — мы, работнікі органаў, вырашалі. Наш "бог" Сталін перадаў нам такое права.

Мой субяседнік на нейкую хвіліну замаўчаў, а потым сказаў: "Не стаміліся мяне слухаць? Калі не, тады раскажу яшчэ, як ствараліся "справы" пра дыверсантаў і шпіёнаў", — і працягнуў:

— Неяк выклікае мяне начальнік — Люшкоў было яго прозвішча — і дае дырэктыву: завесці "справу" чыгуначнікаў — ворагаў народа. Я пачынаю хутка думаць, як выканаць загад. Склікаю сваіх агентаў-сексотаў, загадваю: каб тэрмінова паявіліся дзве "дыверсійныя групы". Для гэтага спярша патрабуецца правакацыя — адна-дзве аварыі на дарозе, няхай з ахвярамі, каб народ быў злейшы... Сказана — зроблена. Дысцыпліна ж была жалезная, "парадак"! Па выніках "расследавання аварыі" арыштавана было трыццаць чалавек (столькі было ўказана ў дырэктыве): начальнік станцыі і яго памочнік, работнікі ўпраўлення дарогі, машыністы і іх памочнікі, качагары, нават пуцявыя абходчыкі і, канешне, стрэлачнік. Хто рангам і кваліфікацыяй вышэй — тых да сценкі. Астатніх — у Варкуту, на Калыму. Некаторым у "справы" мы ўпісвалі, як было загадана, букву "Т" — значыцца, трацкіст. Хоць чалавек аб трацкізме не меў ніякага ўяўлення. За гэтую аперацыю сексоты атрымалі ад 150 да 50 рублёў кожны — у залежнасці ад "звання". Бо сярод іх таксама была градацыя: "залічаны", старшы, радавы. Пераканаўся я тады — колькі ж у нас усялякіх падонкаў. Рэвалюцыя ім дала прастор, яны патрэбны былі Сталіну — "класавую барацьбу" весці. Без іх ніякі НКУС бы не справіўся.

Бедны той народ, у якога сексот — важная асоба. Гэтыя падонкі наперадзе ўсіх рабілі кар'еру. Горш няма, калі гідкія рабы лезуць у кіраўнікі і прымушаюць краіну скакаць пад іх дудку. Яны больш за ўсё баяліся зноў апынуцца ўнізе і ішлі на ўсё, нават на вялікія злачынствы, каб утрымацца ў сваіх крэслах. А чорную работу, выскачыўшы наверх, прымушалі рабіць нас. Няхай даруюць мае ахвяры: я быў толькі выканаўцам, сякераю следства ў руках куды больш страшных катаў.

Пачалася вайна з Германіяй. Скажу шчыра: на фронт мне не хацелася. Я быў упэўнены — жывым не вярнуся. Калі немцы не падстрэляць, дык свае. Нас, чэкістаў, на фронце ненавідзелі. Мы гналі людзей пад агонь, а самі заставаліся ззаду. Але ў завірусе бою, у зручны момант, цябе запраста мог падстрэліць свой — ідзі, разбярыся, чыя куля табе дасталася, — яна, куля, як вядома, дура. Карацей, я ўсяляк круціўся, каб застацца на месцы. І выслужваўся, выкручваўся перад начальствам, як вужака.

Аднойчы прыйшоў сігнал: тэракт у калгасе! Хто ж тэрарыст? Маладая калгасніца, маці дваіх дзяцей, якая нядаўна атрымала пахаронку на мужа... Аказалася вось што. Даўно старшыня калгаса схіляў яе да сужыцельства. Яна яго праганяла. Тады ён ей позву — на працоўны фронт. Ну, яна і здалася. Запрасіла да сябе переначаваць. Напаіла. А толькі ён захроп — параніла яму мужчынскі корань... Ёй адразу шыюць палітыку: маўляў, замах на кіраўніка, адказнага прадстаўніка савецкай улады. Прыгаварылі да расстрэлу. Памятаю, вяду яе з камеры ў падвал, а сам думаю: эх ты, маладзіца, ні за што прападзеш! Муж загінуў, цяпер цябе шлёпнем, дзеткі круглымі сіротамі застаюцца, — за што такі лёс? Рукі дрыжаць, давялося не два стрэлы рабіць, як звычайна, а чатыры. Першы раз са мною такое здарылася — вось такі "вораг народа" трапіўся. Пасля гэтага, у першы ж выхадны, моцна напіўся — усё не мог забыць тую жанчыну, за душу ўзяла. Ну, а потым зноў страляў і страляў — справа звычайная. Лягчэй было, калі расстрэльвалі крымінальнікаў-сексотаў. Яны сваю справу зрабілі, памаглі нам — і хопіць ім жыць, быць сведкамі таго, што не павінен ведаць народ. Заўтра колькі трэба можна новых сексотаў набраць — гэтага дабра хапала. А палітычных, хто па пяцьдзесят восьмым знакамітым артыкуле, — іх, як я ўжо казаў, страляць было цяжэй...

Звычайна да нас паступала шыроўка — маўляў, чакайце этап "мерцвякоў". Мы пачыналі рыхтаваць камеры для смертнікаў. Я да гэтага часу памятаю нумары тых камер, хоць прайшло больш за паўвека: 11, 18, 20, 21. Спярша этап мыўся ў лазні, прыводзіў сябе ў парадак. А праз тыдзень крывавая лазня — расстрэл. У мяне была для гэтай справы брыгада — пяць чалавек. Мы дзейнічалі так: я звязваў смертнікам рукі папругаю і вёў у падвал. Там даваў яму такі выспятак, што ён адлятаў у кут і падаў. А ў той момант, калі ён падаў, трэба было паспець яго прыстрэліць з пісталета. За мною ішоў і вёў "свайго" смертніка Палявы, затым Мядзведзеў, яшчэ дваіх з брыгады ўжо не памятаю па прозвішчах. Потым мы зноў ішлі ў камеру, забіралі другую партыю і тым жа макарам дзейнічалі. І так — пакуль не наб'ём нябожчыкамі падвал даверху. Яшчэ з намі быў судавыканаўца Бажко. Ён трымаў спецыяльную піку — прабіваў скроню ці патыліцу расстралянага. На ўсялякі выпадак, каб ніхто жывы не застаўся. Увечары мы засоўвалі трупы ў спецыяльныя мяшкі і вывозілі ў лес і закопвалі.

Пасля смерці Сталіна нешта стала мяняцца. Мы адчувалі — будуць вялікія змены. Пачалі звальняць нашага брата, саджаць, нават расстрэльваць. Напрыклад, Мядзведзева расстралялі. А Палявога і мяне пасадзілі. Далі па пяць гадоў. Але праз два гады выпусцілі на пасялуху. На ёй сустрэўся з такой жа, як я, пасялянкаю. Аленай з вашай вёскі. Яе разам з бацькам і маці ў час калектывізацыі вывезлі ў Сібір. Бацька і маці Алены аддалі Богу душы на лесапавале, а яна неяк выжыла. Прыкіпеў я сэрцам да сіраціны. А яна да мяне. Пажаніліся. Выйшла, што карнік выбраў сабе жонку са сваіх ахвяр. Заставацца ў Сібіры мне было небяспечна і страшна. Ведаў, што чакае расплата, што калі не сёння, дык заўтра заб'юць мае былыя "кліенты". Пасля адбыцця тэрміну паехалі адразу сюды, на яе Радзіму. Калгас даў хатку. І пайшоў я рабіць калгасным пастухом, каб менш сустракацца з людзьмі, каб быць адnаму з каровамі. Дваццаць пяць гадоў адтарабаніў на ферме. Стаў перадавіком. Граматы, прэміі... Не раз хацелі паставіць брыгадзірам, але я кожны раз адмаўляўся. Цяпер дажываю апошнія дні. Пенсія ў мяне высокая, не калгасная. Выходзіць, плацяць яе за колішнія забойствы, за здзекі над людзьмі. За тое, што быў сталінскім карнікам. Вер ці не вер, але ў вёсцы пра маё мінулае ніхто не ведае. Не ведала і нябожчыца жонка. Думала, калі з ёю жыў, што я таксама з раскулачаных. Нічога не гаварыў ёй пра сябе, бо органам падпіску даў. Табе першаму расказаў, бо жыць мне засталося зусім мала. Не працягну і да зімы. І дай слова, што раскажаш ці напішаш пра мяне толькі тады, калі мяне не будзе на гэтым белым свеце. Дзяцей я не нажыў з нябожчыцай Аленай, родзічаў нідзе ў мяне няма, і жахлівы сорам за мяне не апячэ іх душы.

Ну, хопіць спавядацца. Расказаў — і на душы трохі стала лягчэй...

Ён змоўк. Я зірнуў у яго нязголены, замшэлы, як гнілая калода, на якой мы сядзелі, твар, і не вытрымаў, дрыжлівым ад хвалявання голасам спытаў:

— А беларусаў вы?..

— Расстрэльваў і тваіх землякоў. Але запамятаўся толькі адзін.

— Чым?

— Перад расстрэлам усё па-беларуску лемантаваў: "Я нічога ніякага і нікому нічога!.."

* * *

Праз тры месяцы пасля нашай апошняй сустрэчы і размовы я атрымаў з роднай вёскі пісьмо. Вельмі кароценькае, скупое на словы, падобнае на тэлеграму. У ім мне паведамілі, што Сямён Іванавіч Маслаў памёр і пакінуў перад смерцю запіску, каб мне паведамілі пра гэта.

Тады я дастаў з шуфляды стала свой пісьменніцкі сшытак з запісамі споведзі сталінскага карніка і вырашыў, як мы з ім дамовіліся, расказаць у артыкуле пра гісторыю яго жыцця.

Мікола КАПЫЛОВІЧ,
пісьменнік.

Народная Воля
11 ЛІПЕНЯ 1997 г.

Дайджест

Доисторические пернатые

Певчие птицы впервые появились более пятидесяти миллионов лет назад в Австралии. По информации агентства ДПА, к такому выводу пришел австралийский биолог Уолтер Боулз, обнаруживший северо-восточнее города Брисбен останки певчих птиц, возраст которых может быть датирован именно этой датой. Агентство также сообщает, что окончательные результаты исследований еще не получены, но уже сейчас можно говорить о том, что все предыдущие версии не имеют под собой никакой научной почвы. Агентство также приводит данные, согласно которым после завершения работ Уолтер Боулз намерен полностью воссоздать внешний облик первых представителей пернатых, населявших Землю в доисторические времена.

Чем возмущается министр Клаудия Нольте?

Министр социальной защиты семьи Федеративной Республики Германия Клаудиа Нольте воспрепятствовала распространению на рынке страны альбома немецкого певца Вики Вомита. По информации газеты "Майнпост", возмущение Клаудии Нольте вызвала песня Вики Вомита "Любовь с Клаудией" с его нового альбома "Бум Бум", в которой он в вульгарных выражениях описывал ночь с министром. Адвокатам Клаудии Нольте удалось доказать, что эта песня являлась грубым нарушением ее права на тайну и охрану частной жизни. Газета также сообщает, что, придя в отчаяние от запрета на продажу своего альбома, Вики Вомит намерен в ближайшее время выпустить песню под названием "Клаудия меня больше не любит".

Аэрофлот для... "идиотов"?

Британская "Дэйли Телеграф" опубликовала статью о крупнейшей российской авиакомпании — "Аэрофлоте". Статья приурочена к началу телевизионной рекламной кампании "Аэрофлота", которая стартует на следующей неделе. Она должна убедить пассажиров, что российская авиакомпания — надежный перевозчик. Позиции "Аэрофлота" на международном рынке слабы — три года назад Международная ассоциация авиапассажиров заявила, что "лишь идиот, не заботящийся о своей безопасности, будет летать "Аэрофлотом", отмечает газета. Сознавая трудность поставленной задачи, авторы рекламных роликов выбрали в символы авиакомпании слона — только он может ее осилить. Традиционный русский медведь был отвергнут из-за избитости образа, пишет "Дэйли Телеграф".

Инцидент в космосе и новые программы

Газета "Медиенхаус" публикует материал, посвященный аварии, произошедшей 25 июня на российской космической станции "Мир". Газета сообщает, что, несмотря на оптимистические заявления представителей российских официальных органов, большинство специалистов утверждают, что в результате столкновения станции "Мир" с грузовым кораблем "Прогресс-34" космическая станция получила значительные повреждения, которые могут привести к полному выходу ее из строя. Газета также приводит данные, согласно которым в результате аварии значительные повреждения получили солнечные батареи, что, в свою очередь, может привести к нарушению энергоснабжения и отключению всех действующих приборов. По мнению газеты, произошедший инцидент, который был далеко не первым и едва не стоил жизни трем космонавтам, скорее всего, станет причиной прекращения всех международных космических программ, в которых предусмотрено использование российской космической станции.

Фестивали

Болгарский "Праздник на розата" украсила белорусская "Чарніца"

Долина роз

В центре Болгарии есть небольшой городок Казанлык. Если подъезжать к нему со стороны горного перевала, ведущего из Габрово в Шипку, то, минуя острый гребень перевала, попадаешь в невообразимой красоты уголок: перед глазами внезапно открывается залитая солнцем долина роз.

Болгары с гордостью рассказывают о том, как много веков назад посаженный случайно в этой местности цветок розы настолько поразил своей красотой местных жителей, что они стали выращивать его, и уже спустя несколько лет слава о Казанлыкской розовой долине разнеслась по всей Европе.



На центральной улице Казанлыка — гости фестиваля.

О появлении розы на болгарской земле ходит много легенд и историй, но каждая из них заканчивается словами: "И с тех пор божественный цветок розы навсегда поселился на земле болгарской".

Конечно, дать объяснение, почему Казанлыкская долина стала местом выращивания роз, несложно. Сама природа этого края как будто заботится о нежном и таинственном цветке. Долину со всех сторон окружают горы: они словно оберегают хрупкие беззащитные розы от ветров и ливней. Рядом растянулась река Тунфия, а благоприятнее климата не найдешь, пожалуй, во всем мире: мягкая зима, +10 в феврале, когда закладываются цветочные почки, высокая влажность в мае и июне. В эти первые по-настоящему теплые дни девушки из окрестных деревень собирают лепестки роз. Собирают ночью, с 3 часов и до 9 утра, когда розовое масло из корней цветка "перекочевывает" в лепестки. В такие дни Казанлык оживает, круглые сутки слышатся смех, музыка, песни.

В 1903 году богатые жители Казанлыка решили в дни сбора розового масла устроить в городе праздник роз — своеобразный фестиваль народной песни и танца. Со всех окрестных деревень съехались в Казанлык крестьяне. Несколько дней не смолкали в долине роз песни, на десятки километров слышались музыка, смех, гомон. В эти дни в городе устраивались различные конкурсы, специально к фестивалю были изданы открытки с видом розовой долины. А часть собранных средств организаторы праздника пожертвовали бедным жителям Казанлыка и местной больнице. Подобные фестивали вносили разнообразие в жизнь казанлычан еще три года.

В 1963 году местные власти возобновили традицию проведения подобных праздников, а с 1968 года фестиваль стал международным.

"Праздник на розата"

Именно такое название получил Международный фестиваль фольклорной музыки, который проходит в Казанлыке во время сбора розового масла. В этом году он стал двадцать девятым. Коллективы из Болгарии, Греции, Македонии, Югославии, Сербии, Турции собрались на фестиваль. В этой палитре музыкальных красок не затерялся и белорусский коллектив из Заславля "Чарніца".

Нельзя передать великолепия праздника, радости, добросердечности болгар, встречавших гостей фестиваля. И трудно поверить, что в годы социализма, когда организацией фестиваля занимались местные партийные власти, "Праздник на розата" проходил еще с большим размахом и шиком. В этом году тоже было много песен, конкурсов, причем пели и танцевали не только гости фестиваля — фольклорные коллективы из разных стран, но и весь Казанлык. А главное — сама атмосфера, настроение и... неповторимый, божественный запах роз.

Когда настало время расставания и участники фестиваля с песнями и танцами проходили по центральным улицам Казанлыка, девочки в национальных болгарских костюмах осыпали их розовыми лепестками. И, казалось, не будет конца этому веселью и радости...

Заславская "Чарніца" покорила и болгар

Несомненно, выступление белорусского коллектива на болгарском "Празднике на розата" никого не оставило равнодушным. Теперь о заславской "Чарніце" заговорили и в Болгарии. Коллектив, который в таком составе выступает уже четыре года, открыл многим народам самобытность духовной культуры Беларуси, ему рукоплескали в разных уголках нашей республики, на Украине, в Молдове, в прошлом году он принимал участие в международном фестивале в Германии в дни чествования 750-летия города Браунфельса.

Почему именно "Чарніца" представляла нашу республику на международном фестивале в Болгарии? В прошлом году фольклорный ансамбль из этой страны выступал в Беларуси. Когда болгарские артисты услышали, как поет "Чарніца", загорелись идеей пригласить коллектив на фестиваль роз в свою страну. "Заславские самородки покорят нашу родину", — не уставали повторять болгары.

Но приглашение — это еще не все. Нужны финансы. Писать о том, как "Чарніца" по крохам собирала требуемую сумму, не хочется. Тяжело вспоминать, как участники коллектива сами покрывали таможенные расходы, отстегивая на каждой границе сумму "за экологию", и все для того, чтобы белорусскую народную песню услышали в Болгарии. Кстати, очарованные "Чарніцай" гости фестиваля из Македонии пригласили белорусский коллектив выступить у себя на родине в следующем году.

В чем успех белорусских артистов? По-видимому, в их безграничной, просто сумасшедшей любви к народной песне, танцу, своему краю. В ансамбле поют учителя, воспитатель детского сада, парикмахер, работники заславской станции птицеводства и местного Дома культуры. Почти у всех есть семьи, дети, и тем не менее едва ли не "каждый вечер в час назначенный" они спешат в Дом культуры на репетицию.

Недавно "Чарніцу" возглавил выпускник Белорусского университета культуры Сергей Шереметьев. С его приходом несколько изменился репертуар ансамбля, но направления в творчестве остались прежними. Прежде всего фольклорно-этнографическое, когда песня, слегка обработанная и отредактированная для сцены, раскрывается в своем первородном звучании. Например, изумительная лирическая песня о любви "Ты — мой кавалер". У этой песни есть даже своя история. Участница коллектива Любовь Пунько записала ее у своей мамы на Брестчине, привезла в Заславль, и как только ее услышали в коллективе, сразу запели. Теперь "Ты — мой кавалер" "Чарніца" исполняет на каждом концерте, а Любовь Пунько уверяет, что в брестских деревнях поют еще много замечательных, несправедливо забытых народных песен. И эти песни, считают в коллективе, должны обязательно войти в репертуар "Чарніцы".


Поют Белорусские артисты.

Шуточная песня "Ой, беда" стала едва ли не визитной карточкой коллектива. Веселую, зажигательную, смешную историю о том, "как женился старый дід" и "узяў бабу сорак літ", поют все, кто ее однажды услышал.

Еще одно направление творческой деятельности коллектива — театрализация песни. "Очень важно суметь известную белорусскую народную песню облачить в новую исполнительскую форму и этим удивить зрителя", — говорит Сергей Шереметьев. Именно в таком варианте артисты "Чарніцы" представили зрителям известную старинную народную песню "Сэмэне" о неотразимом деревенском парне Сэмэне, которого все местные девки хотят видеть в роли своего мужа и пытаются завлечь: кто красивыми чулочками, кто подушкой, кто коровой. Но он, в духе нашего времени, выбирает ту, у которой в кармане "зеленеют" американские доллары.

Стоит отметить, что "Чарніца" — это не только народный фольклорный коллектив, но еще и оркестровая группа, которой руководит Анатолий Коленько. А это значит, что со сцены звучит не просто песня, коллектив представляет зрителю развернутую вокально-инструментально-хореографическую композицию.

3 июля "Чарніца" пела на празднике города в родном Заславле, 5 июля выступала в Вязынке на Купаловском празднике. О будущих планах коллектива можно говорить много, ибо "Чарніцу" приглашают буквально на все фестивали и конкурсы в родной Беларуси. Рядом с профессионалами поет народный фольклорный коллектив из Заславля. Поет и зачаровывает зрителя своей песней. Ласковой и строгой, быстрой и медленной, смешной и грустной. И как приятно осознавать, что, несмотря ни на что, сохранилось на земле белорусской народное песенное наследие!



Заславская "Гарніца"

Мария ЭЙСМОНТ.

Духоўны скарб

Каб "заспявала" дрэва пад рукамі

Адрас гэтага чалавека з рукамі майстра-мастака даў мне настаяцель Слуцкай Свята-Касма-Даміянаўскай царквы айцец Мікалай пасля таго, як у гэтым адроджаным з колішняга салдацкага клуба храме я ўбачыў два рукатворныя цуды — кіёты, устаноўленыя перад алтаром. Адзін — раней, другі — крыху пазней. Кіёт — гэта вытачаны з дрэва, па-мастацку распісаны з двух бакоў разьбою аклад-рама пад іконы Маці Божай і Хрыста-Збавіцеля. Вытанчанасць на ім ліній-дарожак, кветкападобных "снапкоў-завіткоў", купалападобны верх з крыжыкам на макаўцы — усё уражвае, напаўняе сэрца радасцю. Ёсць жа людзі на белым свеце, што ўмеюць такое ствараць! Нават падумалася: не іначай чалавек гэты ў гадах, з немалым жыццёвым і прафесійным вопытам. Тым болей сёння, калі многія маладыя людзі ідуць у камерцыю, становяцца "чаўнакамі", шукаюць месца там, дзе лепей плацяць.

А ўбачыў пры сустрэчы шчуплаватага чарнявага мужчыну сярэдняга росту гадоў каля трыццаці — Уладзіміра Уладзіміравіча Наруша. Жыве ў тыповым шматкватэрным доме па вуліцы Чэхава з жонкай і дзіцём. У падвале мае, як і ўсе, кладоўку, толькі ў яго яна прыстасавана пад майстэрню, дзе можна "пaverажыць" над дрэвам. На жаль, мужчыны яго ўзросту нярэдка ў вольны час заседжваюцца ля бутэлькі, прыносяць у кватэру не радасць, а разлад, сваркі. А тут — майстар што трэба: вырабляе розныя хатнія рэчы — хлебніцы, падносы да абедзенага стала (не адвесці вачэй ад вытанчаных кветак і ліній!), тумбачкі, шафы, стэлажы для кніг. Пакупнікі сёння знаходзяцца: не часта мы бачым у магазінах выробленую разцом умелага майстра-мастака рэч.

А заяўка з храма была нібы сведчаннем яго прафесійнай сталасці — гэткі "атэстат" на права дотыку да царкоўных святыняў, якім стаяць не адзін дзесятак гадоў.

Талент, калі ён закладзены ў чалавеку ад нараджэння, ранапозна, а праб'ецца на святло, нібы сцябельца з жытнёвага зерня ў полі. У аднаго — раней, у дзяцінстве, у другога, як ва Уладзіміра, прыходзіць у сталым узросце.

Ва многім свайму станаўленню мастака-разьбяра ён абавязаны бабулі, да якой у дзяцінстве яго кожнае лета бацькі-гараджане адпраўлялі ў маленькую вёсачку Канапелькі, што на Уздзеншчыне. Анця Іванаўна, бабуля, была салдацкай удавой, таму ўсё па гаспадарцы ўмела рабіць сама і гэтыя "набыткі" прывівала ўнуку. Уладзімір ужо ў дванаццаць гадоў умеў араць з канём, касіць, накляпаць касу, напіліць і накалоць для бабулі дроў. Пасля службы ў арміі ўладкаваўся ў Слуцкае металаапрацоўчае аб'яднанне слесарам-інструментальшчыкам. Прафесія гэтая патрабавала дакладнага вокамеру, што для яго будучай прафесіі разьбяра так спатрэбілася.

Але на халодны метал вока ён не паклаў — захапіла болей сталярная справа. Наймаўся з сябрамі ў вольны час падрабляць на ўзвядзенні зрубаў жылых дамоў, лазняў. Паявілася ўпэўненасць у тым, што будзе здатны і на большае, калі падвучыцца ў кваліфікаванага разьбяра. Ім і стаў майстар ПТВ-132 Мікалай Гуткоўскі, які вядзе з навучэнцамі гурток разьбы па дрэву. Той ацаніў здольнасці новага вучня і дапамог асвоіць навыкі гэтай рэдкай прафесіі.

Набытыя веды сталі ўвасабляцца ў выробленыя ўласнымі рукамі сцелажы, мэблевыя сценкі з пліт ДСП, тумбачкі. Зірнулі б на гэтыя вытачаныя разьбяром рэчы, дзе кожны квадратны сантыметр так і свеціцца талентам умельца, колішнія настаўнікі Уладзіміра, што ставілі яму "тройкі" па літаратуры, геаграфіі (чамусьці не даваліся яны хлапцу), — не паверылі б, што гэта тварэнне рук таго самага Уладзіка, які не вельмі, па яго ж словах, любіў вучыцца. Затое спасцігнуў не менш патрэбную людзям навуку — разцом прымусіць "заспяваць" дрэва, каб адточаная рэч радавала высокім мастацкім густам.

І калі паступіў заказ на выраб кіётаў, Уладзімір сэрцам адчуў адказнасць, святасць такой работы. Стаяць тым кіётам у храме не адзін год на відавоку соцень прыхаджан. Узяўся за справу адразу, бо патрэбныя матэрыялы — асінавыя і альховыя дошкі — ужо былі назапашаны.

Цікаўлюся ў майго субяседніка, як доўга ён працаваў над гэтым заказам.

